*А.І.СМАГІН*

## У САВЕЦЕ ПА ТЭОРЫІ І ГІСТОРЫІ МАСТАЦТВА

Тэарэтычнае і гістарычнае асэнсаванне працэсаў, якія адбываліся ў розных відах мастацтва, пачалося даўно. Заходнееўрапейскае і рускае мастацтвазнаўства да пачатку XX ст. ужо мела значныя напрацоўкі па розных відах мастацтва, а беларускае мастацтвазнаўства практычна пачало свой шлях толькі ў пачатку XX ст. Прычыны гэтай з'явы дастаткова поўна раскрыты ў працах гісторыкаў, філосафаў і мастацтвазнаўцаў.

Спатрэбіліся дзесяцігоддзі напружанай работы, каб падрыхтаваць неабходныя ўмовы для адкрыцця ў Беларусі аспірантуры і саветаў па абароне дысертацый па спецыяльнасці "мастацтвазнаўства".

Неабходнасць падрыхтоўкі кандыдатаў і дактароў навук па названай спецыяльнасці востра стаяла і ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры. Тая нязначная колькасць выкладчыкаў, якія абаранілі дысертацыі па-за межамі Беларусі, не маглі задаволіць не толькі навуковыя, але і вучэбныя патрэбы універсітэта.

Рашэнне дадзенай праблемы стала магчымым у другой палове 90-х гадоў мінулага стагоддзя, са снежня 1996 г. пачалася падрыхтоўка навукоўцаў па спецыяльнасці 17.00.09 "тэорыя мастацтва", а ў жніўні 1998 г. пачаў сваю працу савет па абароне дысертацый названай спецыяльнасці. У яго склад увайшлі дактары навук па розных відах мастацтва (музыка, тэатр, выяўленчае мастацтва, мастацтва кіно і нават філасофія мастацтва). За невялікі перыяд работы – з 1998 г. па 2001 г. – былі паспяхова абаронены тры доктарскія і чатыры кандыдацкія дысертацыі. Пасля перарэгістрацыі савета 29 сакавіка 2001 г. спецыяльнасць 17.00.09 была пашырана і стала называцца "тэорыя і гісторыя мастацтва".

У трох доктарскіх дысертацыях, якія атрымалі высокую ацэнку ВАК Беларусі, даследаваліся маштабныя праблемы музычнага мастацтва і мастацтвазнаўчай адукацыі.

У дысертацыі доктара мастацтвазнаўства А.І.Смагіна "Харавое мастацтва Беларусі XX стагоддзя" ў кантэксце грамадска-палітычнай, кампазітарскай і выканальніцкай практыкі раскрыта логіка станаўлення нацыянальнага харавога мастацтва XX ст., вызначаны перспектывы яго развіцця ў новым стагоддзі, пераасэнсаваны і актуалізаваны мэты і задачы засваення народна-песенных традыцый, прапанаваны сістэмны падыход да аналізу харавой выканальніцкай практыкі.

В.А.Антаневіч у дысертацыйным даследаванні на тэму "Беларуская кампазітарская творчасць у яе сувязях з фальклорам", выкарыстоўваючы комплексны падыход, паказала гістарычную карціну выкарыстання кампазітарамі беларускага фальклору. Гэта дало магчымасць даследчыку выявіць і абгрунтаваць ролю фальклору ў працэсе развіцця беларускай музычнай культуры, у фармі-раванні кампазітарскіх школ і аднаўленні іх нацыянальнага стылю.

Доктарская дысертацыя В.П.Пракапцовай "Мастацкая адукацыя ў Беларусі: сацыякультурны аспект" – першае навуковае даследаванне, у якім разглядаецца канцэпцыя мастацтвазнаўчай адукацыі як цэласнай сістэмы, пры гэтым комплексны падыход у яе працы злучаецца з гістарычна-параўнальным аналізам мастацтвазнаўчай адукацыі на працягу XI–XX стст.

З сямі абароненых кандыдацкіх дысертацый чатыры адносяцца да музычнага мастацтва. Трэба адзначыць, што дысертацыі прысвечаны вывучэнню новых галін, якія практычна не даследаваліся ў беларускім мастацтвазнаўстве, у іх разглядаюцца і знаходзяць рашэнне даволі значныя праблемы. Напрыклад, Л.Н.Сідаровіч у дысертацыі «"Рыфматворная псалтыр" Сімяона Полацкага і Васіля Цітова: музычна-паэтычны, стылістычны і тэксталагічны аспекты» прапануе новую методыку вывучэння помнікаў нацыянальнай культуры, а В.У.Мазанік у даследаванні "Дырыжорскае мастацтва Беларусі XX стагоддзя" ўпершыню на аснове шматлікіх крыніц, архіўных матэрыялаў паказвае цэласную карціну дынамічных працэсаў станаўлення і развіцця дырыжорскага мастацтва Беларусі на працягу XX ст.

Вельмі глыбокае па сваёй змястоўнасці даследаванне Л.А.Густовай на тэму "Музычна-спеўнае мастацтва праваслаўнай царквы ў Беларусі". Навуковец упершыню праводзіць комплекснае вывучэнне музычна-спеўнага мастацтва ў нашай краіне як самастойнай эстэтычнай з'явы ад яго вытокаў да нашага часу. У працы выкарыстаны новы факталагічны матэрыял, які адлюстроўвае асаблівасці ўвасаблення ў музычна-спеўным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтве хрысціянскай ідэі Богаўвасаблення. Даследаванне праводзілася ў непарыўнай сувязі з гісторыяй царквы і гісторыяй Беларусі.

Неабходна адзначыць высокі навуковы ўзровень дысертацый, падрыхтаваных пад навуковым кіраўніцтвам доктара мастацтва-знаўства Г.І.Барышава. Тэмы гэтых дысертацый не толькі актуальныя, але даволі і арыгінальныя. Сярод даследаванняў вылучаецца дысертацыя Т.В.Катовіч на тэму "Барока як універсальны стыль мастацкай культуры Беларусі XVI–XVIII стагоддзяў". У ёй упершыню ў беларускім мастацтвазнаўстве і культуралогіі прааналізаваны механізм узнікнення і функцыянавання барока як прасторавага і часавага эстэтычнага універсуму. У дысертацыі Н.Д.Піскун "Генезіс і эвалюцыя персанажаў інтэрмедый школьнага і народнага беларускага тэатра XVI – пачатку XX ст.: архетыпы і прататыпы" ўпершыню ў Беларусі тэарэтычна абгрунтаваны генезіс і эвалюцыя персанажаў інтэрмедый школьнага і народнага беларускага тэатра з пазіцыі тэорыі архетыпаў культуры. А.Я.Корсакава ў дысертацыі на тэму «Феномен "мастацкага прымітыву" ў пластычным і тэатральным мастацтве Беларусі XVI–XVIII стагоддзяў» прааналізавала феномен "мастацкага прымітыву" як глабальную з'яву, якая звязана з культурай і мастацтвам Беларусі часоў Вялікага княства Літоўскага, з аднаго боку, і заходнееўрапейскай культурай, з другога. У даследаванні прадстаўлены тэарэтычна распрацаваны навуковы апарат "мастацкага прымітыву", яго класіфіцыйныя і мастацка-выразныя сродкі ў выяўленчым і тэатральным мастацтве Беларусі XVI–XVIII стагоддзяў.

Аналіз абароненых дысертацый у савеце Д 09.03.01 паказвае пераважнасць даследаванняў па праблемах музычнага і тэатральнага мастацтваў, затым выяўленчага. На жаль, не паступалі працы па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, архітэктуры, тэхнагенным мастацтве (кіно-, радыё-, тэле-, відэамастацтва). Да таго ж даследчыкі не выкарыстоўваюць мажлівасці пашпарта савета, які дазваляе абараняць дысертацыі па такіх напрамках, як гісторыка-тэарэтычныя праблемы стылю ў мастацтве, міжнародныя сувязі ў галіне мастацтва, узаемадзеянне прафесійнага, народнага і аматарскага мастацтваў.

Адкрыццё і актыўная праца саветаў па абароне дысертацый у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Інстытуце мастацтвазнаўства этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па-ставіла праблему сумеснай распрацоўкі перспектыўных напрамкаў далейшых даследаванняў розных відаў мастацтва Беларусі, што ў значнай ступені спросціць працу па падборы дысертацыйных тэм і іх адпаведнасці патрабаванням пашпарта савета Д 09.03.01.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ